# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№10 (281)

кастрычнік 2025

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”


**У НУМАРЫ:**

**“Куток Беларусі ў сэрцы Брукліна”: беларусы ўзялі ўдзел у 50-м фестывалі Atlantic Antic**

5 кастрычніка ў Брукліне адбыўся 50-ты фестываль вуліцы Atlantic Antic, у якім штогод удзельнічаюць прадстаўнікі беларускай дыяспары. Актыўны ўдзел беларусаў абумоўлены тым, што на вуліцы, дзе адбываецца свята, размешчаны праваслаўны аўтакефальны Сабор святога Кірылы Тураўскага.

Старонка 5


НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ





# MALDZIS ВЯРТАЕ КАРТУ АРКАДЗЯ СМОЛІЧА

Гэта першая беларускамоўная мапа нашай краіны.

Ініцыятыва MALDZIS выкупіла карту Беларусі, створаную Аркадзем Смолічам і надрукаваную ў Вільні ў 1919 годзе. У супрацы з выдавецтвам Gutenberg і студыяй Imago.by была падрыхтаваная і выйшла ў свет лімітаваная падарункавая копія.

Карта Смоліча – гэта першая беларускамоўная карта нашай краіны. Паводле інфармацыі з мапы, яна была дазволеная вайсковай цэнзурай Польшчы 27 верасня 1919 года і надрукаваная ў майстэрні “N. Mac i syn” у Вільні.

Яе аўтарам лічыцца адзін з бацькоў-заснавальнікаў БНР і першы прафесар геаграфіі ў БССР Аркадзь Смоліч. Мапа мае фізічна-адміністрацыйны характар, які ў шматлікіх дэталях адпавядае падручніку “Геаграфія Беларусі”, што быў выдадзены Смолічам увесну 1919 года таксама ў Вільні.

Кажа Павел Мацукевіч, кіраўнік ініцыятывы MALDZIS: “Гэтая карта ўнікальная тым, што на ёй адлюстраваная ўся тагачасная тэрыторыя пражывання беларусаў. Перад намі паўстае краіна, якая тэрытарыяльна пераўзыходзіць большасць еўрапейскіх дзяржаў, хоць па факце яна такой і не паўстала”.

Да асаблівасцяў мапы належыць і тое, што яна перадае спрадвечна беларускія назвы ў напісанні геаграфічных аб’ектаў: Вільня, Менск, Горадня ў выпадку гарадоў, а таксама Нямеччына і Маскоўшчына ў выпадку краін.

Карта Смоліча была набытая ў Польшчы ў прыватнага калекцыянера на сродкі беларускіх ахвярадаўцаў: Дар’і Сліж і Іллі М.

У будучыні яна будзе перададзеная ў Клічаўскі краязнаўчы музей у якасці грамадскага падарунка. Да вяртання на радзіму карта будзе выстаўляцца за мяжой.

Кажа Рыгор Астапеня, апякун ініцыятывы MALDZIS: “За савецкім часам мапа Смоліча была забароненая, бо паказвала Беларусь як незалежную дзяржаву. Яна захавалася ў некалькіх асобніках і нам пашчасціла набыць адзін з іх. Мы радыя, што разам з партнёрамі даем магчымасць кожнаму чалавеку набыць копію і такім чынам вярнуць мапу да жыцця”.

Карту можна набыць на сайце выдавецтва Gutenberg.

### Факты пра Аркадзя Смоліча

Нарадзіўся ў 1891 годзе ў вёсцы Бацэвічы (Клічаўскі раён, Магілёўская вобласць). Паходзіў з сям’і святара, скончыў Менскае духоўнае вучылішча і семінарыю, але: вучыўся ў Кіеўскім політэхнічным інстытуце і ў Інстытуце сельскай гаспадаркі і лесаводства ў Пулавах.

Быў адным з ініцыятараў абвяшчэння БНР, увайшоў ва ўрад БНР. Пазней стаў першым старшынём Таварыства беларускіх школ.

Пасля вяртання ў Менск у 1922-ім годзе выкладаў у БДУ, стаяў ля вытокаў Беларускай акадэміі навук, стаў адным з аўтараў яе першага статута і ўвайшоў у прэзідыум.

У 1919 годзе ў Вільні надрукаваў “Геаграфію Беларусі”, у якой упершыню сістэмна апісаў этнічныя беларускія землі як адзіную геаграфічную прастору. У тым жа годзе падрыхтаваў і выдаў першую беларускамоўную карту Беларусі.

У 1937 годзе прадстаўнікі Галоўліта БССР пазначылі ў “Спісе літаратуры, якая падлягае канфіскацыі…”: “Смоліч А. – УСЕ КНІГІ”.

Аркадзь Смоліч быў арыштаваны паводле справы “Саюза вызвалення Беларусі”. Пяць гадоў правёў у высылцы спачатку ў Пермскай вобласці, потым у Цюменскай. Яго вызвалілі ў жніўні 1935 года, а ў 1937-м зноў арыштавалі і ў 1938-м расстралялі ў Омску.

maldzis.world

навіны

# “НОЧ (НЕ)РАССТРАЛЯНЫХ ПАЭТАЎ” – У ВІЛЬНІ

Акцыя памяці “Ноч (не)расстраляных паэтаў” адбылася ў Вільні 29 кастрычніка. Нягледзячы на кепскае надвор’е, у скверы каля Музея акупацыі і барацьбы за свабоду сабралася каля 50-ці чалавек.

На вечары са сцэны гучалі прамовы, вершы забітых паэтаў, Валерыя Чарнаморцава прачытала верш былога палітвязня Змітра Дашкевіча, быў адкрыты мікрафон для ўсіх ахвочых. На пачатку акцыі памяці з прамовай выступіў дарадца Святланы Ціханоўскай па адукацыі і навуцы Павел Церашковіч, які нагадаў прысутным сумную гісторыю 1937 года: “Гэта жудасная ноч 29 кастрычніка. Было расстраляна, па розных звестках, ад 102 да 132 чалавек. Чаму розныя звесткі? Таму што быў спіс, падпісаны асабіста Сталіным. Там было 102 чалавекі. А потым ужо на месцы дадавалі. З тых 102 дваццаць два былі пісьменнікі, паэты, драматургі, літаратурныя крытыкі”.



Выступае Мікола Дзядок

На вечарыне памяці з прамовай выступіў былы палітвязень і блогер Мікола Дзядок, які зазначыў, што такія акцыі памяці вельмі важныя і маюць гістарычнае значэнне: “Насамрэч нам можа падацца, ой, такая драбяза, сабралася нейкіх 40-50 “беглых”, як нас называюць у прапагандзе, хоць я не беглы, хутчэй выкінуты, і самы сабе распавядаюць у адрыве ад Беларусі, ад гэтых дзевяці мільёнаў беларусаў, у адрыве ад літоўскага грамадства, для самых сябе. Гэта абсалютна не так. Зададзім сабе пытанне: калі наша імпрэза да такой ступені няважная, мізэрная, чаму сёння не дадуць такое правесці ў Беларусі? Значыць важная. І тое, што робіцца тут, мае вялікае грамадскае, гістарычнае і сацыяльнае значэнне”.

“Ноч (не)расстраляных паэтаў” – імпрэза-ўшанаванне памяці беларускіх літаратараў, расстраляных НКВД у ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года.

Музычна афармілі сёлетнюю акцыю ў Вільні этнацэнтр “Світанак” і дзіцячы гурт “Пацеркі”, гурты “Беларускі цуд” і “Зялёны лес”, в таксама бард і блюзмэн Юрый Несцярэнка і джазмэн Павел Аракелян.

racyja.com


Паэт і перакладчык Андрэй Хадановіч ва Уроцлаве на вечарыне памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій



Ірына Шчасная чытае ўласныя вершы на Ночы памяці ў Музеі Вольнай Беларусі ў Варшаве


Валерыя Чарнаморцава праводзіць шпацыр памяці рэпрэсваных беларускіх дзеячаў у Вільні

**У гэтым годзе імпрэзы прысвечаныя памяці растраляных паэтаў адбыліся больш чым у 13 гарадах па ўсім свеце. Болей інфармацыі шукайце на сайце ZBSB.INFO**

навіны

# МАЦІ КАЦЯРЫНЫ ВАДАНОСАВАЙ НЕ ВЫШЛЮЦЬ З ПОЛЬШЧЫ Ў ЛІТВУ – СУД

Нэлі Ваданосава застанецца ў Польшчы, нягледзячы на Дублінскі рэгламент, згодна з якім яе мусілі адправіць у Літву, бо ў жанчыны літоўская віза, а міжнароднай абароны яна просіць у Польшчы. Такую пастанову прыняў 28 кастрычніка Варшаўскі адміністрацыйны суд.

Маці музыкі і культурніцкай дзячкі Кацярыны Ваданосавай, Нэлі Ваданосавай, усё ж дазволілі застацца ў Польшчы – суд прызнаў, што папярэдняя пастанова аб яе высылцы ў Літву не адпавядае праву і была вынесеная з парушэннямі.

Пасля выезду з Беларусі жанчына падалася на міжнародную абарону ў Польшчы, але польская Памежная ахова 30 верасня апавясціла сям'ю, што Нэлі Ваданосаву збіраюцца адправіць у Літву ўжо 6 кастрычніка, бо яна заехала ў ЕС паводле літоўскай візы.

Кацярына Ваданосава адзначала, што ейнай маці ўжо 74 гады і яна мае мноства хваробаў. Падчасператрусу і допыту ў Менску ў Нэлі Ваданосавай здарыўся інфаркт. У Літве ў жанчыны нікога няма. Кацярына Ваданосава ў каментары “Белсату” адзначала, што ейная маці проста не выжыве без яе.

Кіраўнік Народнага антыкрызіснага ўпраўлення і лідар фракцыі “Каманда Латушкі і Рух "За Свабоду"” ў Каардынацыйнай радзе Павел Латушка звяртаўся да польскіх уладаў з просьбай не дэпартаваць Нэлі Ваданосавай.

Варшаўскі адміністрацыйны суд прыпыніў выкананне пастановы аб высылцы ў Літву да канца кастрычніка, разгляд справы быў перанесены на 28 кастрычніка.



Нэлі Ваданосава (справа) разам з дачкой Кацярынай Ваданосавай, ейным мужам і дзецьмі ў будынку суда ў Варшаве 28 кастрычніка

Пры гэтым адвакатка Ганна Мацыеўская распавядала, што пастанова суда не звязаная з розгаласам і просьбамі палітыкаў: “Усё вырашае выключна суд. Палітычныя структуры не маюць ніякага ўплыву на яго, бо Польшча – дэмакратычная краіна”.

Марыя Міхалевіч, Арсен Рудэнка belsat.eu

# БЕЛАРУСЫ БЕЛЬГІІ ДАПАМАГЛІ ПАЛКУ КАЛІНОЎСКАГА

Прадстаўнікі беларускай дыяспары Бельгіі арганізавалі збор, набылі і даставілі байцам Палка імя Кастуся Каліноўскага генератары і іншы неабходны рыштунак для выканання баявых задач падраздзеламі беспілотных лятальных апаратаў.

Гаворыць актывіст дыяспары беларусаў Бельгіі – Зміцер Піменаў: “Для танка і любой тэхнікі трэба, каб было дызельнае паліва, бензін і салярка. Тое БПЛА без электрычнасці мёртвае. Яно будзе ляжаць мёртвым грузам. Таму для іх электрычнасць як кроў іхняй дзейнасці. Таму тры падраздзяленні атрымаюць тры магутныя генератары. Гэта вельмі важна, бо ў сённяшніх умовах вайны БПЛА – гэта галоўная сіла супраць акупантаў і тэрарыстаў”.



Зміцер Піменаў злева

Актывісты беларускай дыяспары Бельгіі ад самага пачатку шырокамаштабнага расейскага ўварвання ва Украіну вядуць пастаянную дапамогу беларускім байцам Палка імя Кастуся Каліноўскага ў падтрыманні і папаўненні матэрыяльна-тэхнічнай базы.

racyja.com

# ПОЛК КАЛІНОЎСКАГА АКТЫЎНЕЙ ЗОЙМЕЦЦА ПАЛІТЫКАЙ

Пра гэта заявіў камандзір палка Павал Шурмей у сваім відэазвароце.

Ён таксама паведаміў, што цяпер у палку ўсе ключавыя рашэнні будзе прымаць рада камандзіраў. Адным з першых рашэнняў стала стварэнне ветэранскай арганізацыі “Каліноўцы”, прадстаўляць якую будзе Ян Мельнікаў.

Прадстаўніком палітычнай дзейнасці палка будзе сам Павал “Дзядзька” Шурмей. Ён таксама адзначыў, што полк становіцца “больш сучасным і тэхналагічным”.

Полк Каліноўскага быў створаны з беларускіх добраахвотнікаў у сакавіку 2022 года.

Павал Шурмей стаў камандзірам палка Каліноўскага ў ліпені 2024 года

svaboda.org

# КЕРАМІСТКА ГАННА МЯДЗВЕДЗЕВА АТРЫМАЛА ПЕРШУЮ ПРЭМІЮ НА БІЕНАЛЕ МАСТАЦКАЙ КЕРАМІКІ Ў ПАРТУГАЛІІ

Мастачка Ганна Мядзведзева атрымала першую прэмію на Міжнароднай біенале керамікі ў партугальскім горадзе Авейра. Гэты фестываль збірае лепшых керамістаў з усяго свету. Сёлета на конкурсную выставу было пададзена 782 работы ад 488 удзельнікаў, з іх журы адабрала 110 работ 96 мастакоў з розных краін. Сярод крытэрыяў адбору – інавацыйныя падыходы да керамічных тэхнік і матэрыялаў.

Праца Ганны Мядзведзевай, якая выйграла конкурс, мае назву “Дажджлівы дзень”. Гэтая абстрактная скульптура натхнёная прыродай. Калі прыгледзецца, то можна ўбачыць, што ландшафт сапраўды “злоўлены” мастачкай падчас дажджу. Аўтарка выкарыстоўвае напаўвадкую каменную масу (высокатэмпературную гліну з дамешкам тонкага шамоту), з дапамогай якой стварае шматслойныя карункавыя паверхні, што сапраўды нагадваюць ландшафты ці прыродныя фактуры.

Ганна Мядзведзева назірае за мікрадэталямі прыроды – тэкстурамі зямлі ці будовай раслін – і заўважае, што пры павелічэнні яны становяцца падобнымі да архітэктурных канструкцый. Адначасова яна захапляецца велічнымі прасторамі, што адкрываюцца з вышыні, фіксуючы ў памяці іх атмасферу і каларыт.

Свае скульптуры яна назвае медытатыўнымі аб'ектамі, бо за імі стаяць усё ж не канкрэтныя месцы, а сканцэнтраваныя ўражанні і ўспаміны.

reform.news

рэпартаж

# КАНГРЭС – РОК-ФЕСТЫВАЛЬ ДЛЯ ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСІ

XII Міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі прайшоў у Берліне і стаў адной з самых яскравых беларускацэнтрычных падзей верасня. Сёлета форум адбыўся ва Універсітэце Гумбальта пры падтрымцы – у ліку іншых партнёраў – Фонду Конрада Адэнаўэра і Еўрапейскага Саюза.

Дырэктарка па развіцці Беларускай Рады культуры Эліна Калнібалоцкая ўзяла ўдзел у Кангрэсе. На панэлі "Беларуская музейная справа: адказнасць ва ўмовах несвабоды і эміграцыі" яна расказала пра кампанію #art_born_Belarus і прывяла прыклад супрацы з польскімі музеямі – падтрыманы ArtPower Belarus праект перакладчыка Сяргея Шупы, дзякуючы якому быў створаны беларускі аўдыягід для Музея гісторыі польскіх габрэяў POLIN.

Пасля вяртання з Кангрэсу Эліна падзялілася сваімі ўражаннямі ад удзелу ў гэтым буйным форуме:

– Яшчэ да прыезду ў Берлін было зразумела – нас чакаюць тры вельмі насычаныя дні. Трынаццаць тэматычных секцый: ад бяспекі і эканомікі да культуры і гісторыі. І ў кожнай яшчэ па тры–пяць панэляў, прысвечаных больш вузкім пытанням. Нават калі проста чытаеш праграму, вочы разбягаюцца, а адчуванне FOMO (fear of missing out) толькі мацнее: усе тэмы настолькі розныя і прывабныя, што хочацца мець герміёнаўскі махавік часу, каб паспець паўсюль. Гэта прыблізна як на топавым фестывалі – калі б на адной сцэне грала б Nirvana, а паралельна з ёй на другой – Queen.

На адкрыцці адзін з удзельнікаў сказаў: "Вы – будучыня дэмакратычнай Беларусі". Гэтая фраза дакладна перадае настрой і значнасць падзеі. Тут збіраюцца акадэмікі, практыкі, актывісты, каб не толькі прэзэнтаваць вынікі сваёй працы, але і разам думаць пра новыя выклікі, прасторы даследавання і дзеяння. Для мяне ж гэта была ўнікальная магчымасць сустрэцца з беларускай інтэлектуальнай супольнасцю, дзе ідэі гучаць, нібы музыка, і хочацца іх слухаць бясконца.

Як лінгвістка я асабліва захапілася панэллю пра пераклады кнігі Евы Вежнавец "Па што ідзеш, воўча?" на нарвежскую і польскую мовы. Перакладчыкі дзяліліся, як складана перадаць беларускія культурныя асаблівасці іншай мовай. Асабліва цяжка, на маю думку, знайсці баланс – каб і не перагружаць тэкст транслітарацыяй і зноскамі, але й не падмяняць нашыя з'явы рэаліямі з іншых краін і захоўваць аўтэнтычнасць.

Ці, напрыклад, карысна было паслухаць выступы на тэму бяспекі – тое, што зараз хвалюе кожнага ў нашым рэгіёне. З таго, што запомнілася: выступоўца, кажучы пра суб'ектнасць ці васальнасць Беларусі, параўнаў яе з Абхазіяй ці паўднёвай Асецыяй. Я магу не пагаджацца з такім пунктам гледжання, але гэта, лічу, цікавая перспектыва, у гэтым кірунку раней я не думала.







Панэль, у якой я сама брала ўдзел, была прысвечана музейнай працы ва ўмовах несвабоды і эміграцыі. Калегі ўздымалі пытанні суб'ектнасці музея як палітычнага актара, уплыву калектыўнай траўмы на мастацтва, а таксама паказвалі прыклады так званых "музеяў у выгнанні". Гэта было настолькі цікава, што нават з'явілася ідэя правесці асобны кангрэс, прысвечаны толькі гэтай тэме.

Беларуская Рада культуры не працуе непасрэдна з музеямі ці аховай спадчыны, але мы арганізавалі адвакацыйную кампанію #art_born_Belarus. Яна заклікала людзей звяртаць увагу на памылковыя подпісы ў музеях свету – напрыклад, "Марк Шагал – рускі мастак". Для гэтага мы разам з мастацтвазнаўцам падрыхтавалі шаблоны лістоў да кіраўніцтва ўстаноў. Аргументы аказаліся пераканаўчымі, і некаторыя музеі ўжо змянілі подпісы да твораў мастакоў з беларускімі каранямі ў сваіх экспазіцыях.

Такія ініцыятывы асабліва важныя цяпер, калі няма афіцыйнай інстытуцыі, здольнай прадстаўляць нашыя нацыянальныя інтарэсы і абараняць спадчыну мастакоў. Таму менавіта мы павінны быць амбасадарамі сваёй культуры. Гэтая надае ёй бачнасць і суб'ектнасць, а беларусы па ўсім свеце могуць адчуваць "сваё" ў музейнай прасторы. Так ствараюцца "якары прыналежнасці", якіх так бракуе ў эміграцыі.

Таксама як паспяховы прыклад я згадала супрацу з Музеем гісторыі польскіх габрэяў POLIN у Варшаве. Дзякуючы праекту Сяргея Шупы, падтрыманаму ArtPower Belarus, быў створаны беларускамоўны аўдыягід для экспазіцыі. Аўдыёгід на беларускай мове быў даступны і раней, але яго фінансавала беларуская амбасада. Пасля таго, як музей змяніў сістэму аўдыёгідаў і спыніў супрацоўніцтва з амбасадай, гід знік. Але запыт на беларускую мову заставаўся, і цяпер, дзякуючы новаму праекту, ён вярнуўся.

На гэтых прыкладах мы бачым, што музейная праца сёння мае на мэце не толькі захаванне мінуўшчыны. Яна скіраваная таксама на стварэнне жывых, інтэрактыўных, шматмоўных прастораў прызнання.

Агулам, Кангрэс яшчэ раз даказаў: беларуская культура – гэта не перыферыя і не "другасны" пласт беларускіх даследаванняў. Наадварот, культура – гэта поле, дзе захоўваецца памяць, фармуецца суб'ектнасць і нараджаюцца новыя сэнсы, што дапамагаюць грамадству вытрымліваць крызісы і марыць пра будучыню.

Для нас гэта азначае, што праца з культурай павінна быць працяглай і сістэмнай. Нельга ўспрымаць яе як "дадатак" да палітычных ці эканамічных даследаванняў. Яна – аснова, якая надае іншым тэмам чалавечае вымярэнне.

Што да супольнасці вакол кангрэсу, то яна нагадвае рух – жывы, адкрыты, разнастайны. Тут адчуваецца атмасфера ўзаемнай падтрымкі і салідарнасці. Людзі прыязджаюць не толькі прэзентаваць свае працы, але і слухаць, чуць адно аднаго, натхняцца і прапускаць праз сябе чужы досвед. Гэтая атмасфера вельмі нагадвае фестывальную: шматгалосая, творчая, крыху хаатычная, але заўсёды ўзрушальная. Кангрэс паказаў, што ўжо існуе моцная інтэлектуальная і творча актыўная супольнасць, здольная стаць ядром пераменаў і прастораў для сумеснага руху наперад.

bycuIture.org

# УЗНАГАРОДУ НА ГЕСЭНСКАЙ КІНАПРЭМІІ АТРЫМАЎ БЕЛАРУСКІ ПРАЕКТ

Кінапраект "Спадчына" атрымаў узнагароду на Гесэнскай кінапрэміі ў намінацыі "Найлепшы сцэнар". Пра гэта распавёў рэжысёр і сусцэнарыст праекта Аляксей Палуян.

"Удзячны маім ка-сцэнарыстам Эстэр Бернсторф і Бехрузу Карамізадэ! На шляху даўжынёй у 5 гадоў, я таксама меў радасць працаваць з цудоўнымі сцэнарнымі драматургамі Габрыэле Брунэнмаер і Францам Родэнкірхерам. Асабліва ўдзячны маім прадзюсарам Андрэа Шутэ і Дзірку Дэкеру!" – напісаў кінематаграфіст.

"Спадчына" распавядае пра Мінск улетку 2020 года. На фоне спрэчных "перавыбараў" Лукашэнкі беларуская сям'я стаіць перад уласным выбарам: заставацца вернай рэжыму ці далучыцца да супраціву? У цэнтры аповеду – фатограф Павел, які разрываецца паміж прыстасаванствам і паўстаннем.

Здымкі праекту яшчэ не пачаліся, аўтары ўсё яшчэ збіраюць дадатковае фінансаванне.

euroradio.fm

навіны

# "КУТОК БЕЛАРУСІ Ў СЭРЦЫ БРУКЛІНА": БЕЛАРУСЫ ЎЗЯЛІ ЎДЗЕЛ У 50-М ФЕСТЫВАЛІ ATLANTIC ANTIC

5 кастрычніка ў Брукліне адбыўся юбілейны 50-ты фестываль вуліцы Atlantic Antic, у якім штогод удзельнічаюць прадстаўнікі беларускай дыяспары. Актыўны ўдзел беларусаў абумоўлены тым, што на галоўнай вуліцы, дзе адбываецца свята, размешчаны праваслаўны аўтакефальны Сабор святога Кірылы Тураўскага. Штогод нашы землякі збіраюцца разам, каб прыгатаваць беларускія прысмакі і падзяліцца з жыхарамі Вялікага Яблыка нацыянальнымі стравамі, распавесці пра культуру Беларусі і паказаць традыцыйныя строі.

Як адзначыў староста беларускай царквы Аляксандр Хомчанка ў сваім фэйсбуку, "5 кастрычніка прайшоў чарговы, юбілейны 50-ты фестываль вуліцы, на якой размешчаны наш беларускі Кафедральны Сабор Святога Кірылы Тураўскага. Традыцыйна ў "Atlantic Antic" бярэ ўдзел і Кафедра. Акрамя вернікаў царквы, да правядзення свята далучылася шмат беларусаў, якія шматразова ўдзельнічалі і дапамагалі ў падрыхтоўцы да свята. Але было і шмат тых беларусаў, хто прыйшоў у Царкву і ўзяў удзел у святкаванні першы раз. Вельмі прыемна, што да свята далучылася шмат моладзі".

Фестываль выглядае такім чынам, што, шпацыруючы па Атлантак-авеню ў цудоўны восеньскі дзень, вы трапляеце на сапраўднае свята: дэгустацыя страў розных народаў, вытанчаныя творы мастацтва і рамёстваў з усяго свету, бесперапынная музыка, забавы – і проста мора задавальнення. Сярод усёй гэтай прыгажосці жыхары і госці Нью-Ёрка маглі пабачыць і беларусаў, якія шчыра дзяліліся прыгатаванымі прысмакамі.

"Нашыя гаспадыунькі, – адзначае Аляксандр Хомчанка, – некалькі дзён рыхтаваліся да свята і прыгатавалі вельмі смачныя стравы беларуска-ўкраінскай кухні, такія як: варэнікі, дранікі, галубцы, наліснікі, фрыкадэлькі, кілбаскі, тушаную капусту. Было нагатавана столькі, што хапіла на ўвесь дзень гандлю, і вынік атрымаўся вельмі станоўчы. Стаяла чарга, наша моладзь з нацыянальным сцягам і плакатамі запрашала гасцей да стала.

Мы маем шмат пастаянных пакупнікоў, якія спецыяльна прыходзяць, каб пачаставацца стравамі нашай беларускай кухні, дзякуюць нам за прыстойны выгляд Катэдры, распытваюць пра гісторыю будынка, пакідаюць ахвяраванні на Царкву.



Разам з намі валанцёрылі і нашыя цудоўныя ўкраінскія дзяўчаты Валянціна Бардакова і Людміла Бакунец, якія прапанавалі на продаж нацыянальныя ўкраінскія аўтэнтычныя рэчы і сувеніры. Грошы, зароблены з удзелу ў Фестывалі, пойдуць на дапамогу УСУ і беларускім добраахвотнікам з Палка імя Кастуся Каліноўскага".

У беларускай дыяспары ёсць людзі, якія ўжо на працягу доўгага часу штогод прымаюць удзел у святе. Адна з іх – Аксана Пятрашка, якая прыклала неверагодныя намаганні для атрымання спецыяльнага сертыфіката (food licens – дазвол на продаж ежы), без якога ўдзел у фестывалі быў бы немагчымы.

Спадарыня Аксана падзялілася сваімі ўражаннямі ад фестывалю і распавяла пра прыналежнасць да беларускай супольнасці:

"Калі мы з сям'ёй прыехалі ў Нью-Ёрк, адразу пачалі наведваць нашу беларускую царкву на 401 Atlantic Avenue і сталі актыўнымі ўдзельнікамі галоўных падзей беларускай суполкі ў Амерыцы.

Я добра памятаю свае пачуцці з таго часу – пачуццё адзінства, сяброўства, сапраўднай беларускай сям'і і асабліва глыбокага пагружэння ў беларускую культуру. Гэта быў і застаецца наш духоўны і культурны дом.

З 2019 года я і мой муж Сяргей з дзецьмі пачалі прымаць удзел у штогадовым фестывалі Atlantic Antic, які праходзіць у самым сэрцы Брукліна. Гэтая падзея заўсёды аб'ядноўвае беларусаў з розных куткоў Амерыкі. Людзі прыязджаюць з Філадэльфіі, Канэктыкута, Нью-Джэрсі і нават з Флорыды. Atlantic Antic наведваюць сем'і з дзецьмі, моладзь, сябры, каб разам гатаваць беларускую ежу, дапамагаць у наладжванні гандлёвых сталоў і палатак і працаваць з самай раніцы да вечара ў дзень фестывалю.

Кожны год гэта сапраўднае свята беларускай еднасці! Мы ўзнімаем наш бел-чырвона-белы сцяг, гучаць беларускія песні, і куток вуліцы Брукліна на адзін дзень ператвараецца ў маленькую частку Беларусі.

Асаблівы гонар выклікае тое, як людзі розных нацыянальнасцей і рас падыходзяць да нашага століка, каб пачаставацца дранікамі, варэнікамі з бульбай, галубцамі, налеснікамі і іншымі беларускімі стравамі.

Многія пытаюць пра наш сцяг, пра Беларусь, пра культуру. І заўсёды прыемна бачыць, як нават незнаёмыя людзі адчуваюць нашу шчырасць і адкрытасць.

З уласнага досведу магу сказаць: наш беларускі характар – добры, сумленны і спагадлівы – заўважаюць усе навокал. А колькі таленавітай моладзі і дзяцей, якія размаўляюць па-беларуску, можна ўбачыць тут!

Гэты куток Беларусі ў Амерыцы дае нам пачуццё роднага цяпла, народнага адзінства і надзеі".

Штогадовы фестываль Atlantic Antic з'яўляецца адным з найстарэйшых і найбуйнейшых вулічных фестываляў у Брукліне. Падзея адбываецца кожны год на пачатку кастрычніка. Сёлета фестываль адсвяткаваў свой 50-гадовы юбілей.

**Наста Пабягунская, Budzma.org**

# "БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА Ў ПОЛЬШЧЫ" ЗАКЛІКАЛА СПЫНІЦЬ АНТЫМІГРАНЦКУЮ РЫТОРЫКУ

Кіраўнік Таварыства "Беларуская дыяспара ў Польшчы" Аляксей Дзікавіцкі апублікаваў адкрыты ліст да польскіх палітыкаў, СМІ і грамадства з заклікам спыніць "антыміграцкую рыторыку".

Кажа Аляксей Дзікавіцкі:

– Апошнім часам мы назіраем сітуацыю, калі ў публічнай прасторы з'яўляецца пэўная рыторыка, якая, вядома, выкліканая тым, што частка грамадства апасаецца наплыву нелегальных мігрантаў у Польшчу. Але пры гэтым аўтары гэтых выказванняў, гэтай рыторыкі часта абагульняюць і кажуць, што мігранты – гэта дрэнна для Польшчы, будуць сацыяльныя выплаты патрабаваць, будуць злачынствы. Гэта ў пэўным сэнсе распаўсюджваецца на ўсіх мігранатаў.

У лісце падкрэсліваецца, што большасць беларусаў, якія знайшлі прытулак у Польшчы, падтрымліваюць эканоміку краіны, з'яўляюцца адукаванымі і працавітымі людзьмі, якія культурна блізкія польскаму грамадству. Дзікавіцкі адзначае, што папулісцкая антыміграцкая рыторыка часта перабольшвае праблемы і не адлюстроўвае рэальны стан рэчаў.

**racyja.com**



навіны

# ФЕСТЫВАЛЬ “БЕЛАРУСКІ КІРМАШ У ДАЎГАЎПІЛСЕ” У 15-Ы РАЗ АБ’ЯДНАЎ СЯБРОЎ

11 кастрычніка 2025 года ў вялікай канцэртнай зале Палаца культуры пры поўным аншлагу прайшоў XV Міжнародны фестываль народнай культуры “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”, арганізаваны Цэнтрам беларускай культуры Дома адзінства.



Штогадовы фестываль “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”, мэтай якога з’яўляецца захаванне і папулярызацыя культурнай спадчыны беларусаў, а таксама ўмацаванне міжкультурнага дыялогу і міжнародных сувязяў, сабраў аматарскія беларускія калектывы з розных гарадоў Латвіі, Літвы, Эстоніі і Польшчы.

У гэтым годзе культурны форум прайшоў пад знакам юбілею і рэтраспектывы. Арганізатары звярнулі свой погляд у мінулае і прагарталі летапіс, як просты канцэрт за пятнаццаць гадоў, мяняючы тэмы і пашыраючы геаграфію ўдзельнікаў, развіўся да міжнароднага фестывалю беларускай дыяспары краін Балтыі.

У фае Палаца культуры гледачоў чакалі перасовачная фотавыстава фестывальных момантаў розных гадоў, экспазіцыя восеньскіх дароў і хатніх нарыхтовак, майстар-класы па традыцыйнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці беларусаў і кніжная абменная акцыя.

На гала-канцэрце выступілі 18 творчых калектываў. Большую частку з іх склалі ансамблі з Латвіі, якія прадставілі ўсе рэгіёны краіны. Пералічым усіх. З Латгаліі былі даўгаўпілскія “Купалінка”, “Лянок”, “Паўлінка”, “Пралескі”, “Спадчына” і “Скарбніца”; “Рабінушка” з Прэйлі, “Узоры” з Ліван, “Сузор’е” з Рэзэкнэ, “Крыніца” з Лудзы і “Аколіца” з Дагды. З Курзэмэ завіталі вентспілская “Журавінка” і ліепайская “Мара”. Упершыню на фестывалі выступілі елгаўскі “Лянок” (Земгалэ) і рыжская “Надзея” (Відзэмэ).

У сваю чаргу замежныя госці прыехалі з Літвы, Эстоніі і Польшчы: “Світанак” (Вісагінас), “Сябры” (Нарва) і “Світанак” (Беласток).

Міжнародны фестываль вітала кіраўніца Дома адзінства Даўгаўпілскага дзяржаўнага гарадскога самакіравання Дзіяна Солданэ.

Дзве з паловай канцэртныя гадзіны праляцелі на адным дыханні, бо ўдзельнікі і гледачы зацікаўлена ўспаміналі, што было на папярэдніх фестывалях, быццам учора. На вялікі экран выводзілася афіша кожнага фестывалю, нагадвалася яго тэма і галоўныя факты. Потым гучалі фальклорныя альбо сучасныя песні, ішлі народныя альбо сцэнічныя танцы, а звязвалі выступленні тэатральныя мініяцюры ў спалучэнні з вясковым гумарам.

Як развіваўся “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”, нагадвала кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская.

5 лістапада 2011 года беларусы Даўгаўпілса ладзілі першы Кірмаш, выглядалі нявест і жаніхоў.

Тэмай другога Кірмашу сталі сялянскае жыццё і сватанне. Упершыню прыехалі замежныя госці – з Літвы і Беларусі.

Гледачы трэцяга Кірмашу пазнаёміліся з традыцыяй заручын.

Чацвёрты Кірмаш афіцыйна набыў статус Міжнароднага фестывалю народнай культуры з назвай “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”. На ім яскрава адгулялі беларускае вяселле.

Пяты фестываль атрымаўся двойчы юбілейным – пятым па чарзе і прысвечаным юбілею Даўгаўпілса. Гледачам паказалі народны абрад хрышчэння немаўля. Упершыню завіталі госці з Эстоніі і Польшчы.

Тэмай шостага Кірмашу было свята ўраджаю. Фестываль набыў свой лагатып – арнаментальны млын.

Сёмы Кірмаш быў прысвечаны тэме кахання. І таксама з любоўю была выдадзена друкаваная кніга пра даўгаўпілскі фестываль.

Восьмы Кірмаш прайшоў пад знакам стагоддзя Латвійскай Рэспублікі. У 2018 годзе ў Цэнтры беларускай культуры сабралі куфар беларускіх скарбаў і адкрылі музейную хатку.

Дзявяты фестываль гудзеў на вясёлым панадворку.

Дзясятаму Кірмашу не пашанцавала праз кавідна-пандэмійныя абмежаванні. Аднак беларусы зрабілі юбілейны Кірмаш у відэафармаце і выдалі “смачную” кулінарную кнігу.

Далей фестываль пераехаў з Палаца культуры ў Дом адзінства. На 11-м Кірмашы беларусы збіралі ўраджай, на 12-м тэмай была вясковая сядзіба.

13-ты Кірмаш адбыўся пасля культурнай рэформы ў Даўгаўпілсе, калі Цэнтр беларускай культуры стаў структурнай часткай Дома адзінства. Таму на 13-м Кірмашы паразважалі: чым чорт не жартуе!

На 14-м Кірмашы беларусаў аб’яднала хата бацькоў.

15-ты юбілейны Кірмаш вярнуўся ў Палац культуры і быў прысвечаны юбілею горада, Даўгаўпілсу – 750!

Розныя па характары і малюнку канцэртныя нумары – лірычныя і філасофскія, вясёлыя і сумныя, хіты і аўтэнтыка – гледачы прымалі “на ўра”: падпявалі, плакалі, апладзіравалі ад душы.

Завяршыўся юбілейны канцэрт песняй “Кірмаш, кірмашок” (аўтар слоў Галіна Сантоцкая, музыкі – Вячаслаў Пятроў), якая стала гімнам “Беларускага кірмашу ў Даўгаўпілсе”. Спявалі ўсе ансамблі – удзельнікі 15-га фестывалю, на вялікай сцэне Палаца культуры, і іх віталі шматлікія гледачы, стоячы, шчырымі і шчодрымі апладысментамі.

А потым на сяброўскай спеўцы ўдзельнікі фестывалю прымалі падзякі і сувеніры, віншавалі ідэйнага заснавальніка фестывалю Галіну Францаўну Сантоцкую, абменьваліся меркаваннямі, будавалі планы на новы год.

Ужо 15-ты раз фестываль “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе” стаў пляцоўкай для сустрэчы аматарскіх калектываў беларусаў Балтыі, для зносін са сваімі гледачамі, для абмену лепшымі ўзорамі народнай культуры і рэалізацыі сваёй нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. А арганізатары ўжо прыдумалі тэму новага, 16-га Кірмашу, але пакуль трымаюць яе ў таямніцы.

**Жанна Раманоўская, кіраўніца Цэнтра беларускай культуры Дома адзінства, bkc.daugavpils.lv**

Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

in memoriam

# ЮРКА ХМЯЛЕЎСКІ ПРА ВАЛЯНЦІНА КАРЫЦКАГА І МІХАЛА КАНДРАЦЮКА, ЯКІЯ ПАЙШЛІ АД НАС У ЛЕПШЫ СВЕТ У ВЕРАСНІ

## Валянцін Карыцкі

Сёння [7 верасня 2025 г.] на могілках у Праневічах пад Бельскам пахавалі войта гміны Бельск-Падляшскі Валянціна Карыцкага. Памёр раптам 5 верасня ў сваім доме. Толькі што з жонкай вярнуўся з Беластока з юбілею 25-годдзя Саюза вясковых гмін Падляшскага ваяводства, які ўрачыста святкавалі ў оперы. Адышоў рана, маючы 62 гады. Яго смерць шмат каго ўсхвалявала, бо ён быў вядомай персонай у рэгіёне, таксама ў нашым беларускім асяроддзі.

Ён быў з майго пакалення. Пасля тэхнікума ў Бельску закончыў універсітэт у Любліне. У палове васьмідзясятых гадоў стаў там адным з заснавальнікаў і першым старшынёю Брацтва праваслаўнай моладзі. З часам стаў дзеячам Польскай сялянскай партыі (PSL) і заняў высокія пасады ў структурах самакіравання. Быў віцэ-маршалкам ваяводства, ваяводскім і павятовым радным. У 2017-2024 гг. працаваў як сакратар гміны ў Боцьках. У апошніх самаўрадавых выбарах стаў войтам гміны Бельск-Падляшскі.

Падчас адпявання і паніхіды вечарам папярэдняга дня ў бельскай Успенскай царкве прысутнічала вельмі шмат людзей. У чарзе на апошняе развітанне стаялі палітыкі, чыноўнікі мясцовага самакіравання, таксама звычайныя жыхары гміны, Бельска, Беластока, рэгіёна, якія ведалі нябожчыка і прыбылі з патрэбы сэрца развітацца з ім і выказаць спачуванні яго блізкім.

Супрасльскі епіскап Андрэй у сваёй пропаведзі падкрэсліў, што памерлы, як мала хто іншы, умеў спалучаць высокія грамадскія і адміністрацыйныя пасады з быццём добрым чалавекам, адкрытым да іншых і прывязанасцю да Праваслаўнай царквы.

З Валянцінам Карыцкім я быў крыху знаёмы. Помню, як летам у 2017-га ці 2018-га года ён з сімпатычнай жонкай Касяй з'явіўся ў Міхалове на беларускім фольк-фестывалі. Абое мелі на сабе майкі з нашымі свойскімі народнымі арнаментамі. Я тады быў там намеснікам бурмістра і на банкеце пры стале яны сядзелі насупраць. Размаўлялі мы, вядома, па свойму – я чыста па-беларуску, а ён на роднай гаворцы. Як адзін з нешматлікіх „віпаў" не саромеўся і часта так гаварыў, незалежна ад абставін.

Другі раз сустрэліся мы ў мінулым годзе на Іллю ў Падбеллі. Ад трох месяцаў ужо быў ён войтам Бельскай гміны, да якой належаць вёскі вакол Бельска, а ў тым ліку частка гэтага прыходу. Падчас святочнага набажэнства, седзячы на лавачцы ля царквы, мы паразмаўлялі крыху пра актуальную дзяржаўную і гмінную палітыку. Карыцкі быў аптымістам. Расказаў мне пра буйныя інвестыцыйныя планы ў сваёй гміне, перад усім пра асфальтаванне дарог. Быў добрай думкі. Сказаў мне таксама, што польскі ўрад накіраваў у Сейм праект паправак да закона аб салэцкім фондзе, каб у кожнай гміне быў ён абавязковы (канчаткова дэпутаты такую змену адхілілі). Дагэтуль залежыла гэта ад родных. У гміне Бельск-Падляшскі такі фонд быў выдзелены. Дзякуючы таму жыхары паасобных вёсак самі вырашалі на што выдаткаваць гэтыя грошы, хаця не занадта вялікія, бо пераважна ад 15 да 20 тыс. злотых. Карыцкі, калі стаў войтам, працягваў такую практыку. З салэцкага фонду гміна пераважна рамантуе вясковыя дарогі, абсталёўвае святліцы і падтрымлівае культурніцкія мерапрыемствы.



Валянцін Карыцкі (1963-2025)

4 сакавіка з нагоды Агульнапольскага Дня солтыса ў Беластоку адбылося падвядзенне конкурсу на найлепшую ініцыятыву, здзейсненую ў рамках салэцкага фонду. Былі ўзнагароджаны ажно пяць вёсак з гміны Бельск-Падляшскі. Войт гэтым ганарыўся.

Тады на свяце ў Падбеллі расказваў мне таксама пра свае паездкі на Святую гару Афон. З адной прывёз ікону, якую перадаў у царкву ў маіх Крынках.

Валянцін Карыцкі асабіста і як чыноўнік дапамагаў таксама арганізаваць у яго гміне беларускія фэсты. Якраз на дзень яго пахавання была запланаваная такая імпрэза ў Дэніскаx. Меўся там адбыцца чарговы фэст „І там жывуць людзі". Арганізатар – Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы – адклікаў мерапрыемства з увагі на жалобу пасля раптоўнай смерці войта гміны. З гэтай прычыны 7 верасня не адбыўся таксама фэст БГКТ у Бельску-Падляшскім. Арганізатары перанеслі яго на наступную нядзелю.

Вечная памяць...

## Міхал Кандрацюк

Не стала прафесара Міхала Кандрацюка. Пахавалі яго сёння [19 верасня 2025 г.] у Варшаве, дзе здаўна жыў з сям'ёй і працаваў там у Польскай акадэміі навук і ва ўніверсітэце. Пасля адпявання ў царкве Яна Клімака на Волі спачыў на мясцовых могілках.

Памёр 10 верасня на 92 годзе жыцця. На Беласточчыну вестка прыйшла тры дні пазней, калі ў фэйсбуку пра смерць свайго прафесара паінфармаваў д-р Васіль Сегень, старшыня БГКТ. У каментары я напісаў:

Надта цёпла ўспамінаю Прафесара яшчэ з часоў, калі меў Ён у „Часопісе" пастаянную рубрыку, у якой тлумачыў паходжанне назваў беларускіх і не толькі мясцовасцей на Беласточчыне. Дзякуем за Яго навуковыя кнігі і выданні як помнік нашай гісторыі і культурнай спадчыны. Вечная памяць...

Маё асабістае знаёмства з прафесарам пачалося неўзабаве, як з'явіўся „Часопіс". З 1993 г. на нашых старонках доўгі час публікаваў ён артыкулы, у якіх паясняў менавіта паходжанне назваў мясцовасцей і характэрных на Беласточчыне прозвішчаў насельніцтва. У міжчасе запрапанаваў мне вёрстку кнігі пад яго рэдакцыяй. Быў гэта тоўсты том з дакладамі з нейкай міжнароднай навуковай канферэнцыі даследчыкаў дыялектаў і анамастыкі (назваў) на польска-ўсходнеславянскім памежжы. Мне як тэхнічнаму рэдактару праца над кніжкаю заняла шмат часу. Бо тэксты былі на некалькіх мовах і да таго трэба было густа ўстаўляць спецыяльныя літары і знакі націску. Але адначасова ўчытваўся я ў змест артыкулаў і помню, што вельмі мяне яны зацікавілі.

Прафесар прыязджаў тады з Варшавы на працу ў беластоцкім універсітэце. Часта прыпыняўся ў сваёй універсітэцкай кватэрцы па вуліцы Свярковай нават тады, калі быў ужо на пенсіі і я там яго наведваў.

Як беларус родам з падгайнаўскіх Дубін стаў выдатным аўтарытэтным навукоўцам у галіне мовазнаўства ў дачыненні да перш за ўсё беларускага насельніцтва на Беласточчыне. На працягу дзясяткаў гадоў рабіў свае скрупулёзныя даследаванні. Быў адным з першых выпускнікоў беларускай філалогіі ў Польшчы, а пасля ініцыятарам стварэння і арганізатарам беларускай філалогіі, загадчыкам яе кафедры ў Беластоцкім універсітэце.

Яшчэ як студэнт, пасля навуковы супрацоўнік Інстытута славяназнаўства Польскай Акадэміі навук у Варшаве ўздоўж і ўпоперак абышоў ён усю Беласточчыну ў складзе шматлікіх даследчыцкіх экспедыцый. Тады ўсюды гучала беларуская мова з яе шматлікімі дыялектамі. Было што запісваць. Як хутка аказалася – у самы апошні момант, перад маланкавым наступам паланізацыі і ўрэшце абязлюдненнем вёсак. Прафесару Кандрацюку і яго супрацоўнікам з дапамогай сту-



Праф. Міхал Кандрацюк (1934-2025) у Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку вясной 2023 г.

дэнтаў удалося зафіксаваць вялікае моўнае і культурнае багацце. Выйшла яно друкам у дзесяці тамах славутага „Атласу ўсходнеславянскіх гаворак Беласточчыны". Цяпер гэта помнік нашай гісторыі і памяці продкаў. Праф. Кандрацюк падрыхтаваў амаль палову матэрыялу, ён запісаў мову больш за пяцідзесяці вёсак. Быў вельмі працавітым і плённым навукоўцам. Стаў выдатным славістам, мовазнаўцам, шматгадовым выкладчыкам беластоцкага філіяла Варшаўскага ўніверсітэта, пасля Беластоцкага ўніверсітэта, сябрам Польскай акадэміі навук. З'яўляецца аўтарам больш за двухсот навуковых выданняў, у тым ліку дзесяці кніг.

Яго імя як аўтарытэта ў галіне лінгвістыкі і даследчыка славянскіх і балтыйскіх дыялектаў згадваецца ў польскіх, беларускіх, украінскіх і літоўскіх энцыклапедыях.

У 2011 г., калі ў гміне Орля войт і радныя прынялі рашэнне ўвесці ў сябе двухмоўныя польска-беларускія назвы мясцовасцей, кансультаваліся перад усім з праф. Міхалам Кандрацюком. І гэта ён прапанаваў беларускія варыянты назваў 25 тутэйшых вёсак так, каб былі найбольш блізкія арыгінальным з дыфтонгамі (на запіс з „лучкамі" не дазваляў закон).

Прафесар з паловы дзевяностых гадоў быў каардынатарам навуковых канферэнцый „Шлях да ўзаемнасці". Ладзіліся яны яны да 2019 года перамена ў Беластоку і Гродне Беларускім грамадска-культурным таварыствам і Саюзам палякаў у Беларусі (пасля расколу – Гродзенскім універсітэтам). Як напісаў Юрка Ляшчынскі на сайце Радыё Рацыя, „шлях да ўзаемнасці, які меў наблізіць нашыя народы, дзякуючы палітыкам абапал мяжы, завёў у тупік".

Апошні раз бачыліся мы вясной 2023 года на прэзентацыі яго чарговай кніжкі „Матэрыяльная культура беластоцкай вёскі і яе змены ў святле народных гаворак XX стагоддзя", выдадзенай на два гады раней – перад пандэміяй – Фондам імя князя Канстанціна Астрожскага. Сустрэча адбылася ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку. Вяла яе Анна Радзюкевіч, рэдактарка штомесячніка „Przegląd Prawosławny". Яна падкрэсліла, што нягледзячы на свой пажылы ўзрост прафесар, якому пайшоў тады дзевяносты год жыцця, усё адчувае сябе добра і ёсць інтэлектуальна актыўны. Толькі пазайздросціць, сказала.

Міхал Кандрацюк быў актыўны да апошніх дзён. Працаваў над слоўнікам простай мовы, запісаным паўстагоддзя таму на Сакольшчыне яго сябрам і супрацоўнікам прафесарам Станіславам Глінкай.

Вечная памяць...

*Юрка Хмялеўскі, галоўны рэдактар, czasopis.pl*

**навіны**

# У ЗША ПАХАВАЛІ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕННІКА, ЗНІКЛАГА АМАЛЬ 50 ГОД ТАМУ

24 кастрычніка на могілках царквы Жыровіцкай Божай Маці Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі) быў пахаваны зніклы амаль 50 гадоў таму пісьменнік Мікола Цэлеш.



Фэйсбук Натальлі Гардзінкі (Courtesy Photo)

Пра гэта паведаміла на сваёй старонцы ў фэйсбуку гісторык Наталля Гардзіенка.

Мікола Цэлеш нарадзіўся 25 ліпеня 1900 у Заазер'і Барысаўскага павета, цяпер Лепельскі раён Віцебскай вобласці. Вучыўся ў Бялыніцкім народным вучылішчы да 1914 года, калі бацьку з пачаткам Першай сусветнай вайны мабілізавалі ў расейскую імператарскую армію. З 1916 года жыў у бежанстве ў Варонежы, працаваў на пошце, потым перабраўся ў Кацярынаслаўскую губерню. У 1919 годзе скончыў агульнаадукацыйныя курсы і мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Дэмабілізаваўся ў 1922 годзе і прыехаў у Менск. У пачатку 1933 года працаваў у аддзеле сельскай гаспадаркі рэдакцыі "Звязды". Перад Другой сусветнай вайной працаваў у часопісе "Паляўнічы Беларусі".

У час нямецкай акупацыі працаваў у "Беларускай газеце". З чэрвеня 1944 года ў Нямеччыне. У 1949 годзе выехаў у ЗША. Жыў у Нью-Ёрку. Зарабляў фізічнай працай. Быў сябрам Беларуска-амерыканскага задзіночання. У 1976 годзе ў Нью-Ёрку знік без вестак.

У кнізе Барыса Сачанкі "Пад сузор'ем сярпа і молата" згадана перапіска Цэлеша з Максімам Танкам: "Мікола Целеш выкладаў умовы, паводле якіх ён згадзіўся б пераехаць жыць на Бацькаўшчыну, у Беларусь. Галоўным з іх былі змена таталітарнага рэжыму, наданне Беларусі сапраўднага суверэнітэту, незалежнасць ад Масквы". Сачанка бачыў тут сувязь з тым, што Цэлеш потым "выйшаў з дому і знік".

Цела пісьменніка знайшлі ў 1991-м, але здолелі ідэнтыфікаваць толькі ў 2025 годзе. Наталля Гардзіенка апісвае, як знайшлі і ідэнтыфікавалі цела пісьменніка:

"Паводле звестак паліцыі, цела было знойдзенае яшчэ ў 1991 годзе ў сажалцы на ферме ў мясцовасці ў ваколіцах тагачаснага месца жыхарства пісьменніка – гарадка Порт Джарвіс у штаце Нью-Ёрк. Цела знайшлі, калі чысцілі сажалку. Пры Міколу Цэлешу была торба з ягонымі рукапісамі, якія папсавала вада. А на самой торбе ў надпісе захавалася апошняя літара ягонага прозвішча „ш". Тады ў 1991 годзе цела не змаглі ідэнтыфікаваць, яно захоўвалася ў адмысловым сховішчы больш за тры дзесяцігоддзі, пакуль сёлета асоба не была пацверджаная праз тэст ДНК".

Наталля Гардзіенка расказвае пра паездку дачкі пісьменніка ў БССР у 1979 годзе.

"Яна паспрабаваць высветліць, ці не вярнуўся пісьменнік на радзіму, дзе засталіся сем'і двух сыноў ад першага шлюбу. На савецкай мяжы яе саму дапытвалі спецслужбы наконт лёсу бацькі… Слядоў пісьменніка ў Менску не знайшла. Затое па вяртанні яе наведвалі агенты ФБР, якія таксама задавалі пытанні наконт зніклення бацькі. Найбольш абмяркоўвалася версія, што Мікола Цэлеш быў пакараны за адмову вярнуцца ў БССР. Яшчэ за колькі гадоў да зніклення да пісьменніка наведваліся савецкія службоўцы, што намаўлялі ехаць на радзіму. Ці сапраўды савецкія спецслужбы знішчылі беларускага пісьменніка, сёння адказу так і няма. Прысутныя на пахаванні дэтэктывы пацвердзілі, што справа застаецца адкрытаю і следства працягваецца. Нават нягледзячы на тое, што прайшло амаль паўстагоддзя".

Паведамляецца, што на пахаванні дачка Кэрал Тыптан і прадстаўнікі беларускай грамады дзякавалі дэтэктывам за іх працу і згадвалі самога Міколу Цэлеша і ягоныя кнігі, у тым ліку апошні збор твораў "Хмары над Бацькаўшчынай", выдадзены пасмяротна Беларускім Інстытутам Навукі і Мастацтва яшчэ ў 1995 годзе.

**svaboda.org**

# АСАЦЫЯЦЫЯ ПА СТВАРЭННІ БЕЛАРУСКАГА ДАСЛЕДЧАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ АСТАФІЯ ВАЛОВІЧА ЗАРЭГІСТРАВАНАЯ Ў ПОЛЬШЧЫ

23 верасня 2025 года Раённы суд у Варшаве (XII Гаспадарчы аддзел Нацыянальнага судовага рэестра) прыняў пастанову аб рэгістрацыі асацыяцыі "Astafiej Valovic Belarusian Research University".

Арганізацыя атрымала нумар у KRS: 001195918 і мае юрыдычны адрас у Варшаве па вуліцы Aleje Jerozolimskie 89, лак. 43.

Рэгістрацыя асацыяцыі азначае завяршэнне падрыхтоўчага этапу і пераход да юрыдычна замацаванага існавання ініцыятывы па стварэнні Беларускага даследчага ўніверсітэта імя Астафея Валовіча.

"Гэта ўжо ўніверсітэт? Яшчэ не. Але першы крок, каб універсітэт быў афіцыйна прызнаны ў адукацыйнай прасторы Польшчы", – напісана ў сацсетках універсітэта.

**budzma.org**

## Беларускі каляндар памятных дат на лістапад 2025 года

**1 лістапада**
• 110 гадоў таму, у 1915-м, нарадзіўся Міхась Кавыль (сапр. Язэп Лешчанка), паэт, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Памёр у 2017-м.

**6 лістапада**
• 85 гадоў таму, у 1940-м, памёр Лявон Вітан-Дубейкаўскі, паэт, архітэктар.
• 45 гадоў таму, у 1980-м, памёр Станіслаў Станкевіч, літаратуразнавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**8 лістапада**
• 135 гадоў таму, у 1890-м, нарадзіўся Янка Пачопка, паэт. Памёр у 1977-м.

**11 лістапада**
• 150 гадоў таму, у 1875-м, нарадзіўся Альберт Паўловіч, паэт, драматург. Памёр у 1951-м.

**12 лістапада**
• 140 гадоў таму, у 1885-м, нарадзіўся Міхайла Грамыка, пісьменнік, вучоны. Памёр у 1969-м.
• 105 гадоў таму, у 1920-м, нарадзіўся Валерый Навіцкі (да 1945 г. – Валянцін Новік), дзеяч эміграцыі ў Канадзе. Памёр у 2001-м.
• 105 гадоў таму, у 1920-м, нарадзіўся Андрэй Макаёнак, драматург. Памёр у 1982-м.

**13 лістапада**
• 400 гадоў таму, у 1625-м, памёр Саламон Рысінскі, паэт, філосаф, этнограф.

**14 лістапада**
• 120 гадоў таму, у 1905-м, нарадзіўся Міхась Васілёк (сапр. Міхаіл Касцевіч), паэт. Памёр у 1960-м.

**15 лістапада**
• 40 гадоў таму, у 1985-м, памёр Аляксандр Калодка, праваазнавец, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**16 лістапада**
• 120 гадоў таму, у 1905-м, нарадзіўся Ян Скрыган, пісьменнік. Памёр у 1992-м.

**17 лістапада**
• 200 гадоў таму, у 1825-м, памёр Зарыян Далэнга-Хадакоўскі, славяназнавец.
• 20 гадоў таму, у 2005-м, памерла Клаўдзія Шышыгіна-Патоцкая, даследчыца гісторыі Нясвіжа.

**20 лістапада**
• 40 гадоў таму, у 1985-м, памёр Юрка Геніюш, пісьменнік.

**21 лістапада**
• 195 гадоў таму, у 1830-м, памёр Ян Снядэцкі, астраном, матэматык, філосаф.

**22 лістапада**
• 95 гадоў таму, у 1930-м, нарадзілася Вера Бартуль (дзяв. Касцюкевіч), дзеячка эміграцыі ў Вялікабрытаніі і ЗША. Памерла ў 2006-м.

**25 лістапада**
• 115 гадоў таму, у 1910-м, нарадзіўся Змітрок Астапенка, паэт. Загінуў у 1944-м.

**26 лістапада**
• 95 гадоў таму, у 1930-м, нарадзіўся Уладзімір Караткевіч. Памёр у 1984-м.

**27 лістапада**
• Дзень Герояў

**Беларусы ў свеце**
№ 10 (281), кастрычнік 2025
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар – Н. Шыдлоўская, А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com